ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (1210) ● 22 чэрвеня 1978 г. Цана 2 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

У ПАРТКОМЕ БДУ ● **ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: ПРАБЛЕМЫ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНЦКАЙ ПАРТГРУПЫ** ● НАСУСТРАЧ СУСВЕТНАМУ ФОРУМУ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ У ГАВАНЕ ● **«КОШТ ЖЫЦЦЯ». ПРАЦЯГ НАРЫСА АБ БЫЛЫМ ВАЕННЫМ УРАЧУ С. ЦІХАМІРАВЕ** ● У АБ'ЕКТЫВЕ — СЕСІЯ ● **РЭПАРТАЖ З ЭКЗАМЕНА** ● ВЫТВОРЧАЕ АБ'ЯДНАННЕ «ІНТЭГРАЛ» — БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА: СУПРАЦОЎНІЦТВА РАЗВІВАЕЦЦА ● **НОВЫЯ КНІГІ, ПАСТУПІЎШЫЯ Ў БДУ** ● СТАРТЫ ГА ● **СУСТРЭЧА ДЛЯ ВАС** ● ДЫКТУЕ МОДА ● **ТВОЙ ЭТЫКЕТ**

## У парткоме

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта было разгледжана пытанне «Аб рабоце партыйнага бюро і дэканата біялагічнага факультэта па павышэнню эфектыўнасці падрыхтоўкі спецыялістаў-біёлагаў». З дакладам выступіў дэкан факультэта прафесар А. Ц. Пікулеў.

У прыватнасці дэкан адзначыў, што партбюро і дэканат факультэта праводзяць значную работу, накіраваную на далейшае ўдасканаленне вучэбнага працэсу, павышэнне ўзроўню і эфектыўнасці навуковых даследаванняў, далейшае ўмацаванне адзінства працэсу навучання і выхавання з мэтай паляпшэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

Факультэт здзейсніў пераход на новыя вучэбныя планы па ўсіх трох спецыяльнасцях. На кафедрах рэгулярна пераглядаюцца і абнаўляюцца праграмы агульных курсаў і дысцыплін спецыялізацыі, уводзяцца новыя спецкурсы. На факультэце і на кафедрах працуюць метадычныя камісіі. Шырэй сталі ўкараняцца ў вучэбны працэс тэхнічныя сродкі навучання.

Ёсць станоўчыя змены і ў навукова-даследчай рабоце. Да выканання навукова-даследчых работ больш шырока сталі прыцягвацца студэнты. У гэтым навучальным годзе звыш 70 працэнтаў студэнтаў дзённага аддзялення заняты рознымі формамі НДРС. На біяфаку працуюць 10 навуковых гурткоў, 2 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі (кафедр агульнай экалогіі і мікрабіялогіі). 89 працэнтаў навуковых студэнцкіх работ аднесены да першай катэгорыі на Рэспубліканскім аглядзе-конкурсе. Студэнты надрукавалі 18 навуковых работ і прадставілі 70 дакладаў.

Забеспячэнню адзінства вучэбнага і выхаваўчага працэсаў было прысвечана некалькі дакладаў на факультэцкай метадычнай канферэнцыі ў гэтым годзе. Каардынацыя ўсіх форм выхаваўчай работы здзяйсняецца саветам куратараў.

Партбюро і савет факультэта аддаюць вялікую ўвагу павышэнню эфектыўнасці вучэбнага працэсу. Практычна на кожным пасяджэнні партбюро або савета, на кожным партсходзе разглядаецца які-небудзь бок гэтага пытання. На некаторых кафедрах праводзяцца сумесныя пасяджэнні кафедр, партгруп і камсамольскіх бюро.

Разам з тым у дакладзе былі адзначаны недахопы, якія яшчэ маюцца.

У спрэчках выступілі загадчыкі кафедр біяфака, сакратар партбюро факультэта і іншыя.

Па разгледжанаму пытанню партыйны камітэт прыняў пастанову.

**Л. АНДРЭЕВА.**

Партыйнае жыццё

## Авангард — студэнцкая партгрупа

Партгрупа аддзялення філасофіі — адна з самых вялікіх на гістфаку. У ёй налічваецца 32 камуністы і 1 кандыдат у члены КПСС. Работа ў партгрупе аддзялення філасофіі вядзецца па наступных асноўных напрамках: вучэбная і навуковая; работа з маладымі камуністамі; работа з камсамольскім актывам; інтэрнацыянальная работа.

З мэтай павышэння паспяховасці студэнтаў, паляпшэння арганізацыі работы па ўказаных напрамках у партгрупе створаны адпаведныя сектары; адказныя за сектары вядуць практычную работу сумесна з сектарамі камсамольскай арганізацыі.

Якімі ж асноўнымі формамі работы мы карыстаемся на практыцы? Гэта справаздачы камуністаў па выкананню імі патрабаванняў Статута, вучэбнай праграмы, абмеркаванне ўдзелу студэнтаў у грамадскай рабоце. Так, у 1977-78 годзе было заслухана 7 камуністаў па пытаннях вучэбнай, навуковай і грамадскай работы. У ходзе справаздач было выяўлена, што некаторыя камуністы (К. Шарамет, С. Каравая) недастаткова рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў, а камуніст Т. Сцяпанава слаба ўдзельнічае ў рабоце камсамольскай арганізацыі аддзялення. Партгрупа замацавала за адстаючымі лепшых студэнтаў з мэтай аказання ім канкрэтнай дапамогі.

Выкарыстоўваем мы і такую форму, як замацаванне за кожным курсам камуніста — грамадскага куратара, які пастаянна кантралюе паспяховасць і грамадскую актыўнасць студэнтаў. Вынікі яго работы затым заслухоўваюцца на сходзе партгрупы. Напрыклад, былі заслуханы справаздачы грамадскіх куратараў, камуністаў Л. Хрысціны( адк. за II курс), Л. Асадчай (адк. за I курс). Было выяўлена, што студэнты I курса валодаюць недастатковымі навыкамі работы з творамі класікаў марксізму-ленінізму, пазавучэбнай самастойнай работы. Партгрупа арганізавала сустрэчу студэнтаў I курса са старшакурснікамі і выкладчыкамі. Вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі паказалі пэўныя поспехі ў гэтым напрамку.

Праводзяцца ў нас і агульныя сходы камуністаў партгрупы і камсамольскай арганізацыі, на якія запрашаюцца загадчыкі кафедр і выкладчыкі (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, гісторыі філасофіі і логікі, этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму) і куратары курсаў. Гэта дае магчымасць вучэбныя і арганізацыйныя пытанні рашаць на розных узроўнях. Звычайна такія сходы ў нас праводзяцца адзін раз у семестр.

Па ініцыятыве камуністаў нашай партгрупы на гістарычным факультэце была ўкаранёна новая форма правядзення палітінфармацый: гэта палітбаі. Па заданай раней тэматыцы студэнты двух спаборнічаючых курсаў рыхтуюць шэраг пытанняў, адказы на якія затым рэцэнзуюцца і ацэньваюцца па 10-бальнай сістэме. Журы састаіць з куратараў, вядучых выкладчыкаў факультэта. У ходзе такіх палітбаёў выяўляецца агульнаадукацыйны і тэарэтычны ўзровень студэнтаў па тых ці іншых пытаннях міжнароднага жыцця, камуністычнага і рабочага руху. Гэта форма палітінфармацый была адобрана партыйным бюро гістарычнага факультэта і цяпер шырока ўкараняецца ў практыку.

У сувязі з тым, што папаўненне партгрупы аддзялення філасофіі здзяйсняецца ў асноўным з ліку слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, 2 разы ў год у нас практыкуюцца справаздачы камуністаў падрыхтоўчага аддзялення па выкананню імі вучэбнай праграмы і грамадскай работы. Так, напрыклад, пасля здачы імі зімовай сесіі (залікаў) было заслухана пытанне аб паспяховасці і грамадскай актыўнасці слухачоў падрыхтоўчага аддзялення. У выніку было выяўлена, што амаль усе камуністы здалі зімовую сесію з тройкамі. Сход пастанавіў узмацніць работу са слухачамі падрыхтоўчага аддзялення, назначыць адказнага (камуніста Л. Касцючэнка) за работу з маладымі камуністамі падрыхтоўчага аддзялення. Вынікі праверкі якасці выканання слухачамі падрыхтоўчага аддзялення вучэбнай і грамадскай работы будуць падведзены ў канцы другога семестра.

Нядаўна ў нашай партгрупе адбыўся справаздачна-выбарны сход, на якім былі падведзены асноўныя вынікі работы за мінулы год. У сваіх выступленнях камуністы прынцыпова падышлі да ацэнкі вучэбнай і грамадскай актыўнасці кожнага камуніста, яго канкрэтнага ўкладу ў справу павышэння паспяховасці і дысцыпліны на філасофскім аддзяленні.

Партгрупа намеціла шэраг новых напрамкаў сваёй дзейнасці у наступным навучальным годзе. Напрыклад, асаблівая ўвага разам з выкананнем вучэбных праграм будзе ўдзелена пытанням навукова-даследчай работы студэнтаў, конкурсам навуковых студэнцкіх работ.

Канешне, гэта работа будзе ўвязвацца і з іншымі важнымі напрамкамі нашай дзейнасці. Наогул перад камуністамі нашай партгрупы стаяць адказныя задачы, і, думаецца, мы зможам паспяхова іх выканаць.

**М. ФУРС,**
**партгрупорг аддзялення філасофіі гістфака.**

У студэнтаў апошніх курсаў наступіла самая адказная пара — абарона дыпломных работ і здача дзяржаўных экзаменаў. Праз некаторы час яны атрымаюць дыпломы і стануць маладымі спецыялістамі.



**На здымку:** дзяржаўны экзамен па гісторыі КПСС здаюць студэнты VI курса завочнага факультэта аддзялення гісторыі.

Фота **М. Дубовіка.**

**ДА XI СУСВЕТНАГА ФЕСТЫВАЛЮ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ У ГАВАНЕ**

## МЫ — НА СУБОТНІКУ!

Расце і прыгажэе Мінск. У хуткім часе на Паркавай магістралі гасцінна расчыніць дзверы інстытут праектных арганізацый. Дапамогу будаўнікам у асобных аддзелачных работах, добраўпарадкаванні тэрыторыі будаўнічага аб'екта 10 чэрвеня аказалі супрацоўнікі гістарычнага факультэта нашага універсітэта. У гэты дзень яны правялі суботнік, які адрасавалі XI Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване.

Ва універсітэце ўсёй падрыхтоўкай камсамольска-маладзёжнага суботніка, прысвечанага фестывалю, кіруе спецыяльна створаны агульнауніверсітэцкі штаб. Старшыня яго — сакратар камітэта камсамола А. А. Тозік. Для правядзення суботніка штаб устанавіў цесныя сувязі з будаўнічым трэстам № 4, які вядзе работы на будоўлі інстытута праектных арганізацый. Гэты аб'ект ператварыўся ў месца дыслакацыі суботніка. Адсюль 16 чэрвеня калектыў супрацоўнікаў факультэта прыкладной матэматыкі накіраваў свой працоўны падарунак у гонар інтэрнацыянальнага свята.

«Працаваць па-камуністычнаму!» — пад такім дэвізам 17 чэрвеня тут працавала звыш 250 юнакоў і дзяўчат — слухачоў падрыхтоўчага аддзялення. Да працоўнага свята — Усесаюзнага камсамольска-маладзёжнага суботніка — слухачы правялі дзейсную падрыхтоўку. Стварылі штаб па правядзенню суботніка, у кожнай групе правялі камсамольскія сходы. На іх камсамольцы далі слова працаваць па-камуністычнаму, трымаць марку рабфакаўцаў.

Наладжанае на суботніку сацыялістычнае спаборніцтва паміж групамі выявіла пераможцаў. Лепшых вынікаў дабіліся другая група юрыстаў, якую ўзначальвае У. Казлоў, і група філолагаў, якую ўзначальвала Н. Чылек. Кожная з гэтых груп выканала аб'ём работ на 130 працэнтаў.

У фонд фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване пералічана каля 400 рублёў, заробленых супрацоўнікамі і студэнтамі універсітэта.

**М. НЯХАЙЧЫК,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбнай і навуковай рабоце.**

## ВА «Інтэграл» — БДУ імя У. І. Леніна

# УЧАРАШНІ ВЫПУСКНІК

**Малады спецыяліст і навукова-тэхнічны прагрэс... Сёння, калі навука рухаецца «сямімільнымі» крокамі, гэта праблема стаіць асабліва востра. З якім багажом ведаў ідзе ўчарашні студэнт на прадпрыемства? Які доўгі будзе гэты працэс яго «ўжывання» ў сутнасць сучаснай вытворчасці? Нарэшце, ці адбудзецца ён наогул як спецыяліст, здольны вырашаць актуальныя інжынерна-тэхнічныя задачы?**

**На ўсе гэтыя пытанні дапамагаюць адказаць навукова-вытворчыя аб'яднанні, у якія ўваходзяць прамысловыя прадпрыемствы, навукова-даследчыя інстытуты і ВНУ. Аб вопыце аднаго з іх расказвае начальнік аддзялення навуковага падраздзялення ВА «Інтэграл» кандыдат тэхнічных навук Ю. І. САВОЦІН.**

**— Юрый Іванавіч, творчыя і навуковыя сувязі паміж ВА «Інтэграл» і Белдзяржуніверсітэтам устанавіліся. Па заказу аб'яднання ва універсітэце вяліся многія навуковыя распрацоўкі, рыхтаваліся навуковыя спецыялісты. ВА «Інтэграл» у сваю чаргу аказала універсітэту дапамогу ў арганізацыі вучэбных лабараторый, забяспечваючы іх новым абсталяваннем. Многія выпускнікі БДУ сталі вядучымі спецыялістамі прадпрыемства. На першы погляд адносіны, якія скаліся, і надалей маглі б задавальняць абодва калектывы...**

— Толькі на першы погляд. Для параўнання прывяду такія факты. Год сем-восем назад група інжынераў-распрацоўшчыкаў ВА «Інтэграл» магла спраектаваць выпускаемую на вытворчасці прыладу ў параўнальна кароткі тэрмін і без выкарыстання электронных дапаможнікаў — ЭВМ, якія, вобразна гаворачы, закліканы выконваць ролю «чорнарабочага» ад навукі. Сёння, калі прадпрыемства ад вытворчасці простых прылад перайшло да выпрабу складаных функцыянальна закончаных сістэм, гэта стала немагчымым. Каб спраектаваць такое абсталяванне «уручную», спатрэбіліся б гады напружанай працы соцень інжынераў.

Аб чым гэта гаворыць? Перш за ўсё аб тым, што складанасць канструявання такіх сістэм узрасла ў тысячу разоў. Адпаведна павысіліся патрабаванні і да спецыялістаў навуковага падраздзялення, праектуючага прылады. Але спецыяліст спецыялісту — розніца. Бывае так, што і год і два пройдзе, перш чым малады спецыяліст «дойдзе» да ўзроўню інжынераў нашага падраздзялення, унікне ў сутнасць навуковай работы. А бывае, што спецыяліст так і не адбудзецца.

Страту, нанесеную гэтым грамадству, яшчэ можна падлічыць. Але якімі лічбамі выразіць асабістую трагедыю чалавека, які ўсвядоміў раптам, што ён не змог адолець тое, што адольваюць іншыя?

Таму стварэнне вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання ВА «Інтэграл» — БДУ імя У. І. Леніна накіравана не толькі на тое, каб скараціць тэрміны адаптацыі маладога спецыяліста, але і адабраць з усіх жадаючых займацца навуковай работай тых, хто ў ёй найбольш перспектыўны. Іншымі словамі, аб'яднанне дапамагае вырашыць адну з галоўных праблем пяцігодкі — рацыянальна і эфектыўна выкарыстоўваць кадры.

**— Юрый Іванавіч, некалькі слоў аб методыцы падрыхтоўкі спецыялістаў.**

— Не сакрэт, што вучэбны працэс у некаторых галінах навукі значна адстае ад развіцця вытворчасці. Тлумачыцца гэта слабай тэхнічнай базай лабараторый ВНУ, інфармацыяй, якую зачастую бяруць студэнты са старых падручнікаў.

Каб найбольш цесна звязаць вучэбны працэс з практычнай і навуковай дзейнасцю, пры універсітэце была створана базавая кафедра. Вучэбны працэс, дарэчы, распрацаван выкладчыкамі ВНУ разам з вядучымі спецыялістамі ВА «Інтэграл». Як правіла, на кафедры займаюцца самыя таленавітыя і дысцыплінаваныя студэнты, прайшоўшыя пасля трэцяга курса творчы «адсеў». Лекцыі студэнтам чытаюць не толькі выкладчыкі, але і спецыялісты прадпрыемства. Лабараторныя заняткі праводзяцца ў асноўным на базе ВА «Інтэграл» у абсталяваных па апошняму слову тэхнікі лабараторыях. Акрамя таго, адміністрацыя прадпрыемства клапоціцца аб аснашчэнні лабараторый ВНУ. Затраты на новае абсталяванне, перададзенае аб'яднаннем, складаюць каля 500 тысяч рублёў.

Галоўная роля ў вучэбным працэсе адводзіцца вытворчай і грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў. У сярэднім моладзь практыкуецца ў нас каля васьмі месяцаў. У гэтыя вельмі сціслыя тэрміны студэнт і павінен адапціравацца. Курыруюць вытворчую практыку вопытныя работнікі навуковага падраздзялення, яны ж кіруюць дыпломнымі работамі.

Такое зліццё вучэбнага і вытворчага працэсаў, як паказвае практыка, дае добрыя вынікі. За мінуўшыя пасля стварэння ВНВА два гады былі падрыхтаваны 138 кваліфікаваных спецыялістаў. Большасць з іх, як гаворыцца, знайшлі сябе.

Сёння маладыя спецыялісты вядуць распрацоўку функцыянальна закончаных вузлоў, гэта значыць практычна выконваюць работу старшага інжынера.

Плённа вядзецца і сумесная навуковая работа. Пад кіраўніцтвам вядучых спецыялістаў Белдзяржуніверсітэта і ВА «Інтэграл» студэнты ўдзельнічаюць у самых складаных і актуальных распрацоўках, што, дарэчы, і прадугледжана вучэбнай праграмай.

**— Пасля стварэння вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання прайшло два гады. Як гэта адлюстроўваецца на працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў?**

— У літаратуразнаўстве ёсць тэрмін: адзінства формы і зместу. Яго можна выкарыстаць і ў адносінах вытворчасці. Час дыктуе нам пошукі новых, яшчэ больш дзейсных метадаў падрыхтоўкі спецыялістаў.

Пастаянна абнаўляецца вучэбная праграма. Удасканальваецца арганізацыя праходжання практыкі, прыёму экзаменаў.

Вам не прыходзілася назіраць, як здаюць экзамены студэнты нашай спецкафедры? Даволі арыгінальна. Як і належыць, студэнт цягне білет, рыхтуецца. Толькі рыхтуецца ён не ў аўдыторыі, як гэта заведзена, і не дваццаць, трыццаць хвілін, а... тыдзень. Як паказвае практыка, і гэтага тэрміну не заўсёды дастаткова. І справа тут зусім не ў слабай падрыхтоўцы (наадварот, як мы бачым, яна на даволі высокім узроўні), а ў складанасці нашай вытворчасці.

Напрыклад, кожнаму студэнту мы даём заданне: па тапалагічнай карце якой-небудзь прылады аднавіць электрычную схему і тэхналагічны працэс яе вырабу. Каб выканаць гэтую работу, ім даводзіцца пераварнуць гару часопісаў, пазнаёміцца з перадавымі дасягненнямі. Тут ужо не спішаш! Затое, зрабіўшы разлікі, студэнт набывае масу неабходных для інжынера-распрацоўшчыка ведаў. І яшчэ. Я ўжо гаварыў, што спецыяліст спецыялісту розніца. Адны схільны да навукова-даследчай дзейнасці, іншыя—да кіруючай. У новым навучальным годзе мы ўпершыню ўвялі ў абавязак кіраўнікам практыкі і дыпломнага праектавання аналізаваць дзелавыя якасці студэнтаў. Падрабязныя характарыстыкі на выпускнікоў паступаюць у аддзел кадраў і з'яўляюцца важным дакументам пры размеркаванні на работу. Такі аналіз дазволіць выкарыстаць маладыя кадры па прызначэнню і найбольш эфектыўна.

**— Юрый Іванавіч, некалькі слоў аб праходжанні студэнтамі грамадска-палітычнай практыкі. Што яна з сябе ўяўляе?**

— Выхаванню ўсебакова развітай, гарманічнай асобы мы надаём першаступеннае значэнне. Як гэта здзяйсняецца на практыцы?

Камітэт камсамола ВА «Інтэграл» сумесна з кафедрамі БДУ распрацоўвае падрабязныя планы. Студэнты абавязаны актыўна ўдзельнічаць у камсамольскім жыцці аб'яднання, выступаць перад рабочымі на палітычныя і навуковыя тэмы і г. д. Дарэчы, на экзамене па вытворчай практыцы адзнакі за навукова-даследчую і грамадска-палітычную работу падсумоўваюцца. Былі выпадкі, калі з-за «неактыўнасці» студэнтаў адзнака за практыку зніжалася.

Але ўвогуле выхаванне будучых спецыялістаў знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі з вучэбнай і навукова-даследчай работай. Бо, знайшоўшы сябе ў навуцы і ў калектыве, малады чалавек адначасова знаходзіць яшчэ нешта больш важнае, ад чаго залежыць сэнс усяго яго далейшага жыцця. Гэта лёгка зразумець: калі навічок адбудзецца як спецыяліст, ён, несумненна, адбудзецца і як чалавек.

**Гутарку вёў У. ЯФАНАЎ.**
**(«Интеграл»).**

## НОВЫЯ КНІГІ, ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ Ў КАБІНЕТ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК

**Эканамічныя навукі.**

1. Планомерное развитие социалистической экономии. Под ред. В. Рогачева и Зденко Яуры. М., «Экономика», 1977.
2. СССР и союзные республики в 1976 году. Сообщения ЦСУ СССР и ЦСУ союзных республик об итогах выполнения государственного плана развития народного хозяйства. М., «Статистика», 1977.
3. Финансы СССР. Под ред. М. К. Шерменева. Учебник для вузов. М., «Финансы», 1977.
4. Головченко Г. С., Зернова Т. С. Баланс народного хозяйства. Учеб. пособие. М., «Высшая школа», 1977.
5. Лукин И. И. Воспроизводство и цены. М., «Экономика», 1977.
6. Материально-техническая база коммунизма. Ред. коллегия: Гатовский Л. М. и др. т. 1 и 2. М., «Мысль», 1977.
7. Мартынов Б. М. Встречный план (методология, организация, стимулирование разработки). М., «Экономика», 1977.
8. Научно-технический прогресс. Моделирование народного хозяйства. Отв. ред. И. П. Суслов. Новосибирск, «Наука», Сибирское отд., 1976.
9. Закружный А. А. Управление запасами материальных ресурсов. Минск, «Вышэйшая школа», 1977.
10. Организация управления. Ред. коллегия: акад. Н. П. Федоренко и др. М., «Экономика», 1977.
11. Зиновьев Ф. В. Сборник задач по организации управления в совхозах и колхозах. Учеб. пособие. М., «Колос»», 1977.
12. Новоселов С. П. Обострение экономических и социально-политических противоречий капитализма. М., «Мысль», 1977.
13. Сысоев И. Н. Валютно-финансовая политика международных монополий. М., «Финансы», 1977.
14. Ходов Л. Г., Паньков В. С. Проблемы государственно-монополистического регулирования экономики ФРГ. М., Изд-во Московского университета, 1977.
15. Охрана труда. Учеб. пособие. Под общ. ред. А. Н. Минаева. М., «Просвещение», 1977.
16. Акиншина Н. К. Статистика труда. Учеб. пособие для вузов. М., «Статистика», 1977.
17. Социальные аспекты размещения промышленности. Под ред. Л. В. Козловской. Мн., «Наука и техника», 1977.

**Гістарычныя навукі.**

1. Вспомогательные исторические дисциплины. Т. VIII. Ред. коллегия: Н. Е. Носов, С. Н. Валк (отв. редакторы) и др. Л., «Наука», Ленинградское отд., 1976.
2. Салов В. И. Историзм и современная буржуазная историография. М., «Мысль», 1977.
3. Чапкевич Е. И. Евгений Викторович Тарм. М., «Наука», 1977.
4. Декабристы и Сибирь. Ред. коллегия: А. Н. Копылов (отв. ред.) и др. Новосибирск. «Наука», Сибирское отд., 1977.
5. Русско-турецкая война 1877—1878. Под. ред. И. И. Ростунова. М., Воениздат, 1977.
6. Молодин В. И. Эпоха неолита и бронзы лесостепного Обь-Иртышья. Отв. ред. А. П. Окладников. Новосибирск, «Наука», Сибирское отд., 1977.
7. Советский Союз в годы Великой Отечественной войны 1941—1945. Ред. коллегия: А. М. Самсонов (отв. ред.) и др. М., «Наука», 1977.
8. Гурина Н. Н. Древние кремнедобывающие шахты на территории СССР. Л., «Наука», Ленинградское отд., 1976.
9. Византийские очерки. Труды советских ученых к XV Международному конгрессу византинистов. М., «Наука», 1977.
10. Крижевская Л. Я. Раннебронзовое время в Южном Зауралье. Л., Изд-во ЛГУ, 1977.
11. Абезгауз З. Е. Рабочий класс Белоруссии в начале XX в. (1900—1913 гг.). Мн., «Наука и техника», 1977.
12. Голиков А. Г. В канун Октября. Нарастание общенационального кризиса. М., «Мысль», 1977.
13. Белоусова З. С. Франция и европейская безопасность 1929 — 1939. М., «Наука», 1976.
14. Кошелев В. С. Египет до Эль-Аламейна. Из истории внутриполитической борьбы (1939—1942). Мн., Изд-во БГУ, 1977.
15. Гурвич С. Н. Радикал-социалисты и рабочее движение во Франции в начале XX века. М., «Наука», 1977.
16. Актуальные проблемы стран Арабского Востока и Северной Африки. Ред. коллегия: Е. А. Лебедев (отв. ред.) и др. М., «Наука», 1977.
17. Документы внешней политики СССР. Т. 21. М., Политиздат, 1977.
18. Волобуев О. В. и Секиринский С. А. Художественно-историческая хрестоматия. Средние века. Пособие для учителей. Изд. 2-е. доп. М., «Просвещение», 1977.
19. В лесах Белоруссии. Воспоминания советских партизан и немецких антифашистов. Минск, «Беларусь», 1977.

**Н. СЛАВИНСКАЯ.**

Да 60-годдзя БССР і КПБ

# Старты ГА

Увага. Старт! Ледзь паспеў тэлефаніст перадаць канец кабеля свайму таварышу, і вось ужо пачынае гонку за часам, у якой трэба хутка прабегчы трыста метраў з катушкай і тэлефонам, агульнай вагой каля дваццаці кілаграмаў, а потым наладзіць сувязь з тэлефаністам зыходнага пункта. Нарэшце сувязь наладжана і перадаецца тэкст, які потым дубліруецца радыстам зноў на зыходны пункт. Так пачаліся спаборніцтвы па грамадзянскай абароне, прысвечаныя шасцідзесяцігоддзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Праграма спаборніцтваў уключала ў сябе праверку падрыхтоўкі груп сувязі, хімічнай разведкі і санітарных дружын. Усяго ў гэтых відах спаборніцтваў выступіла дваццаць чатыры каманды навучальных устаноў і прамысловых прадпрыемстваў Маскоўскага раёна. Амаль разам з сувязістамі скончылі выкананне сваіх задач і хімікі-разведчыкі. Яны павінны былі вызначыць зоны заражэння, узяць пробы грунта і арганізаваць спецыяльную апрацоўку людзей і тэхнікі.

Яшчэ больш ускладненая праграма была ў сандружын: праверка іх аснашчанасці, дзеянне ў розных ачагах паражэння, аказанне першай медыцынскай дапамогі «пацярпеўшым».

У гэтым годзе першымі былі групы радыёхімічнай разведкі БДУ і абутковага аб'яднання «Прамень», групы сувязі БДУ і фабрыкі імя Куйбышава. Універсітэцкая сандружна заняла ў спаборніцтвах пятае месца.

**А. БАРЫСАЎСКІ,**
**П. СТАСЕВІЧ.**





**На здымках:** у час спаборніцтваў.

**Фота аўтараў.**

Сустрэча для вас

# ЗНАЙСЦІ ТАКУЮ ЯКАСЦЬ

Хлопчыкам сняцца коні і бліскучыя шаблі ў дыму грамадзянскай. Выразна праступаюць твары байцоў: жорсткія скулы, напружаныя вочы, сціснутыя вусны. Імгненне, і ўзмахі шабляў ператвараюцца ў граніт, шаршавы на вобмацак, як мазолістыя рукі карчагінскага пакалення. Гэтыя рукі маглі не толькі адзяваць чырваназорную будзёнаўку і ўскідваць паходную трубу, яны прапахлі пахам металу і смалы, каменя і зброевага масла, пахам зямлі і поту.

Уяўляць вобраз барацьбітоў за светлую будучыню нам дапамагае гісторыя, нястрымнае ўяўленне, дапытлівая думка мастакоў або пісьменнікаў, якія перадалі нам усю своеасаблівасць і сілу характараў сваіх баявых таварышаў. Ніводны з герояў не ведаў, што воблік кожнага з іх увойдзе ў ганаровую кнігу будучых пакаленняў, назва якой—Памяць. У гэтай сімвалічнай кнізе—імя пісьменніка-бальшавіка Мікалая Астроўскага, якое сімвалізуе подзвіг герояў-камсамольцаў Грамадзянскай.

Не так даўно ўкраінскія кінематаграфісты на кінастудыі імя А. Даўжэнкі стварылі шматсерыйную тэлеэкранізацыю рамана «Як гартавалася сталь». І хаця фільм даўно палюбіўся гледачу, работа над ім для рэжысёра-пастаноўшчыка М. П. Машчанкі ў думках працягваецца. Нейкія дэталі ўпушчаны, недзе святло яркае і г. д. Ну, а для нашага пакалення цяпер вобраз Паўкі Карчагіна ўжо неаддзельны ад вобраза выканаўцы яго ролі — Уладзіміра Конкіна. За выкананне ролі Паўла Карчагіна ён у 1974 годзе ўдастоен высокага звання лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола і звання заслужанага артыста УССР.

— **Валодзя, часта ў кінематографе характэрныя ролі прапаноўваюць выканаць не толькі акцёрам, але і людзям іншай прафесіі. Таму маё першае пытанне: ці выпадковая роля Карчагіна ў вашым лёсе?**

— Бадай, заканамерная выпадковасць. Напэўна, калі б я не скончыў у 1972 годзе з адзнакай Саратаўскае тэатральнае вучылішча, бясспрэчна, не змог бы выразіць, вылепіць прафесіянальна, перадаць сваё ўяўленне аб такім чалавеку, як Карчагін.

Наколькі складаная і адказная работа акцёра, я зразумеў, калі выйшаў на сцэну Харкаўскага ТЮГа. Але работа прыносіла мне вялікае задавальненне. Аднойчы мяне запрасілі на кінастудыю імя Даўжэнкі выканаць у новым тэлефільме «Як гартавалася сталь» маленькую эпізадычную ролю. Я згадзіўся і ўспрыняў гэта як магчымасць хаця б краем вока зазірнуць у невядомы свет, дзе «робяць кіно». Тады не думалася, што праз месяц рэжысёр-пастаноўшчык фільма М. П. Машчанка прапануе мне ўдзел у кінапробах на ролю Паўла Карчагіна. Калі пробы былі зацверджаны, я не ведаў, радавацца гэтаму ці засмучацца. Роля была неймаверна вялікая і вельмі складаная. Мне, маладому акцёру, неабходна было расказаць аб юнацкім і сталым узросце чалавека такога цяжкага часу.

Я успамінаў сваё невялікае і не вельмі складанае жыццё. Як усе —вучыўся ў школе, гуляў з рабятамі ў футбол, кідаў у неба галубоў. І заўсёды навокал былі людзі: бацькі, настаўнікі, таварышы, якія ўдзялялі мне ўвагу і клопат. Рашэнне прыйшло: я быў абавязаны вярнуць людзям доўг дабраты па-свойму: зрабіць іх адпачынак у тэлеэкрана творча насычаным, цікавым. Напэўна так рашаюць не толькі акцёры, але і ўрачы, педагогі, шахцёры, калі гутарка ідзе аб іх прафесіянальным гонары.

— **Працягваючы нашу размову, хацелася б даведацца аб вашым асабістым уяўленні аб Карчагіне.**

— Па-мойму, Павел — сучасны хлопец, таму што рысы яго характару: прамата, упартасць, працавітасць і мужнасць уласцівы і нашаму сучасніку. І гэта вялікае ўнутранае багацце напаўняе воблік Карчагіна святлом нараджэння ўноў. Прага жыцця — самая яркая якасць Карчагіна. Вялікая эмацыянальнасць і спагадлівасць робяць фігуру Паўла то па-радэнаўску пластычнай, злітай з прыродай, то парывістай, быццам палёт вольнага стэпавага ветру. І няхай Павел вядзе сябе часам як хлапчук, нават пускае ў ход кулакі, але робіць гэта ён шчыра, адстойваючы праўду і справядлівасць. Вось менавіта такое адзінства ўнутранага і знешняга робіць Карчагіна чалавекам, да якога, як да магніта, цягнуцца людзі, у якога вераць.

— **Уладзімір, пасля дэбюта фільма аб Карчагіне вы ўжо неаднаразова здымаліся ў кіно. Якая якасць аб'ядноўвае вашых герояў?**

—Мае вобразы ў кіно: афіцэр царскай арміі Ізвольскі («Марына», рэж. Б. Іўчанка), лейтэнант Суслін («Аты-баты, ішлі салдаты», рэж. Л. Быкаў), трубапракатчык Чарада («Пераходзім да кахання», рэж. Б. Фіялка) і іншыя жывуць у розны час і пападаюць у розныя псіхалагічныя сітуацыі, але аб'ядноўвае іх імкненне жыць з поўнай аддачай для грамадства.

— **Ваша самае вялікае жаданне?**

— Неяк рэжысёр Мікалай Паўлавіч Машчанка сказаў, што няма ў жыцці большага жадання, чым стаць нароўні з Карчагіным. Яго словы — гэта мой адказ.

***

Уладзіміру Конкіну 26 год. Яго сыны-блізняты Яраслаў і Святаслаў пойдуць у гэтым годзе ў першы клас. Пройдзе час, і хлопчыкі разам са сваімі равеснікамі будуць зачытвацца бессмяротным раманам М. Астроўскага, вучыцца ў Паўкі адносінам да жыцця.

**С. МЕЛЬНІКАЎ.**



**На здымку: Ул. Конкін.**

# ДЫКТУЕ МОДА

Надыходзіць чарговы сезон, і, адчуваючы сустрэчу з новай модай, мы задаём сабе пытанне: якая яна?

Ніколі яшчэ прапановы моды не былі такімі разнастайнымі, а часам і супярэчлівымі. Усе тканіны, якія абслугоўваюць новую моду, выражаюць агульнае імкненне да зручнасці. Яны лёгкія, пластычныя, упругія. Гэта мяккія фланелі, твід, букле, шаўкавістыя велюры, аблегчаны драп, сукно, габардзін, дыяганаль, класічныя тканіны ў клетку і паласку. Разам з крэпдэшынам, крэпжаржэтам становяцца моднымі тафта, муар, часуча, тканіна з перапляценнем рагожкі, якая імітуе даматканую. З хлапчатабумажных — тонкі паплін, сіцец, піке, рэпс, дыяганаль, вельвет, бархат, батыст, маркізет і вуаль. Папулярны і аднатонныя тканіны, на якіх добра «чытаюцца» канструктыўныя лініі і дэкаратыўная строчка. Незвычайна вялікая цікавасць да «экалагічнай» гамы — колеру неба, туману, воблакаў, травы, кветак, зямлі, камення. У дапаўненне да іх прапаноўваюцца больш яркія і насычаныя колеры, галоўным чынам для спартыўнага, маладзёжнага і адзення фальклорнага стылю.

Спартыўны, фальклорны і класічны стылі ствараюць у сучасным жаночым адзенні вобразныя характарыстыкі. Межы, якія існуюць паміж рознымі стылямі, надзвычай рухомыя: у адным ансамблі або нават касцюме нярэдка аб'ядноўваюцца элементы розных стыляў. Характэрнае для сучаснай моды імкненне зрабіць касцюм максімальна зручным і практычным прывяло да таго, што адзенне ўсё больш і больш становіцца пазасезонным.

Шматслойнасць і камплектнасць адзення па-ранейшаму з'яўляюцца характэрнымі прызнакамі — адсюль і нетрадыцыйнае злучэнне даўжынь. Сукенка на чатыры-пяць сантыметраў даўжэй за паліто, туніка — карацей спадніцы. Модныя паліто надзвычай разнастайныя: найбольш распаўсюджаны варыянт — тыпу трэнч — працягвае заставацца любімым вось ужо на працягу некалькіх сезонаў. Паліто трапецыявіднага сілуэта, без засцёжкі, на таліі сцягнута поясам; паліто-рэдзінгот падкрэслівае лініі фігуры, зрокава падаўжае і робіць яе стройнай. Характэрнымі рысамі сучаснага паліто з'яўляецца мінімум канструктыўных швоў, глыбокія проймы рукавоў, падоўжаная лінія плеч. Рукавы шырокія, свабодныя. Засцёжка, у залежнасці ад выбранай мадэлі, можа быць аднабортная, двубортная, асіметрычная, устык, на маланцы або навясных петлях, на супаце.

Модная дэталь — капюшон, які прышпільваецца. Новая прапанова моды — беспадкладкавае адзенне,— якая паявілася дзякуючы выкарыстанню лёгкіх, мяккіх тканін, менш жорсткіх пракладак і абсалютна новых прыёмаў тэхналагічнай апрацоўкі (усе швы апрацоўваюцца, як на мужскіх кашулях, або акантоўваюцца тасьмой). Тэндэнцыя да шматслойнасці адзення паслужыла прычынай паяўлення камплектаў з дзвюх і больш частак, у аснове якіх — сукенка. Зноў набываюць папулярнасць сукенка-кашуля спартыўнага стылю і сукенка-світар. Для сукенак характэрны глыбокія проймы, шырокія рукавы, напуск на таліі або бёдрах, выраз гарлавіны — карэ, акруглы, лодачка-, V-абразны. Каўняры часам памяншаюцца да памераў стойкі або адсутнічаюць зусім. Класічны касцюм уступае першынство камбінаванаму касцюму, выкананаму з дзвюх або трох тканін-кампаньёнаў. У афармленні касцюмаў спартыўная тэма стане пераважнай.

Твой этыкет

# Ці патрэбны добрыя манеры?

Калі б навейшыя кібернетычныя машыны (якіх яшчэ няма) маглі падлічыць, у што абыходзіцца сума дрэннага настрою, раздражнёнасці, выклікаемых грубымі паводзінамі людзей, яны, гэтыя машыны, паведамілі б нам лічбы, якія прымушаюць сур'ёзна задумацца.

Чалавек, які адчувае сябе спакойна і ўтульна сярод сваіх сграмадзян, у многа разоў працаздольней і прадпрыймальней таго, якому патрэбна быць начаку, каб папярэдзіць незаслужаную знявагу, грубасць, хамства. Добрыя манеры, як праява унутранай далікатнасці і культуры, — неабходны атрыбут сацыялістычнага супольнага жыцця.

Асновы дурных манер ляжаць, як правіла, у псіхалогіі і поглядах чалавека. Што ж гэта за асновы?

Па-першае, заніжанае ўяўленне аб сваіх абавязках. Цярпімасць і гуманнасць нашага грамадства пасялілі ў многіх няўстойлівых душах перакананне, што «ўсё сыйдзе»...

Па-другое, прытупленне пачуцця справядлівасці ўзнікае ў чалавека ў самым раннім узросце, калі яго няправільна выхоўваюць. Чалавек, які развіў у сабе пачуццё справядлівасці, па сутнасці авалодвае вельмі многім. Перш за ўсё ён прывучаецца да думкі, што не мае ніякіх прывілей, ніякіх пераваг перад сваімі таварышамі.

Калі пакапацца ў душы чалавека, здольнага на хамства, то можна знайсці, што яго ўчынкі абапіраюцца на канкрэтныя погляды. Гэта перш за ўсё зняважлівыя адносіны да свайго блізкага і да ўсяго рода чалавечага. І перакананне: урваць ад жыцця як мага больш, не лічачыся з чужымі інтарэсамі.

Нярэдка і самыя добрыя людзі, з якіх у пераважнай большасці складаецца наша грамадства, крыўдзяць сваіх блізкіх. І адбываецца гэта звычайна без усякай прычыны, без усякага злога намеру, а проста так — па недагляду, недамысленню, непа вазе. Добрыя манеры і правільна выпрацаваныя паводзіны прыносяць чалавеку і навакольным каштоўнейшы ў свеце даход — добры і аптымістычны настрой.







У Дзяржаўным мастацкім музеі БССР экспануецца калекцыя злепкаў — шэдэўраў сусветнага мастацтва, якую перадала ў дар музею мастачка Надзея Пятроўна Лежэ-Хадасевіч. Наведвальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца са скульптурнымі помнікамі мастацтва Двурэчча, старажытнага Егіпта, старажытнай Грэцыі, італьянскага Адраджэння, французскага сярэдневякоўя, арыгіналы якіх захоўваюцца ў музеях, храмах і палацах розных краін Еўропы. Злепкі зроблены ў майстэрні пры Луўрскім музеі ў Парыжы. Кожны з іх — дакладная гіпсавая копія, якая захоўвае ўсе знешнія асаблівасці скульптурнага арыгінала, таму што выканана механічным спосабам з дапамогай форм, знятых з арыгінала.

НА ЗДЫМКАХ: Трон Людавізі. Рэльеф «Нараджэнне Афрадзіты». Грэцыя, V ст. да н. э. Арыгінал знаходзіцца у Рыме, у Нацыянальным музеі Тэрм.

Благавешчанне. Гарэльеф правага тымпана фасада сабора Нотр-Дам у Шартрэ. Францыя. Готыка. Канец XII — пачатак XIII ст.

Ніка Самафракійская. Грэцыя. Мастацтва элінізма. III ст. да н. э. Арыгінал знаходзіцца ў Луўры, Парыж.

Фота Т. Аляксандравай.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 03300 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ Тыраж 2000 экз. Заказ № 964.